# Агрэсіўныя дзеянні ЗША ставяць пад пагрозу мір і бяспеку народаў

НЬЮ-ЙОРК, 19 лютага. (ТАСС). Выступаючы 15 лютага на пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН, кіраўнік дэлегацыі БССР К. В. Кісялёў заявіў:

Урад Савецкага Саюза палічыў сваім абавязкам звярнуць увагу ўсіх дзяржаў—членаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый на агрэсіўныя дзеянні ЗША, якія ствараюць пагрозу міру і бяспецы. Гэтая прапанова выстаўлена пасля глыбокага аналізу і працяглага вывучэння міжнароднага становішча. Нажаль, Генеральны камітэт большасцю галасоў адхіліў прапанову Савецкага Саюза і не ўключыў у парадак дня XI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН пытанне «Аб агрэсіўных дзеяннях ЗША, якія ствараюць пагрозу міру і бяспецы». Члены Генеральнага камітэта, якія галасавалі супраць уключэння гэтага пункта ў парадак дня, у асноўным матывавалі сваё галасаванне тым, што быццам-бы Савецкі Саюз, уносячы гэтую прапанову, кіруецца мэтамі прапаганды.

Прадстаўнік ЗША пан Уодсварт, які выступаў перада мною, таксама прабаваў даказаць, што Савецкі Саюз паставіў гэтае пытанне з мэтай прапаганды. Усякі раз, калі Савецкі Саюз ставіць перад ААН пытанні, якія датычаць міру і бяспекі ўсіх народаў, з'яўляецца ўсім вядомы, збіты матыў — прапаганда, і што нібыта з мэтай прапаганды ўносіцца і гэтае пытанне.

## Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. Кісялёва на пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН

ходам паставілі ў цяжкае становішча некаторыя дзяржавы, асабліва ў Заходняй Еўропе. Не дзіўна, што нават у краінах Поўночна-атлантычнага пакта рух народаў, якія патрабуюць змянення палітыкі сваіх урадаў і прывядзення яе ў адпаведнасць з нацыянальнымі інтарэсамі краін, значна ўзрос. Народы адмаўляюць у сваім давер'і тым урадам, якія прабуюць працягваць авантурыстычны курс на абвастрэнне міжнароднай абстаноўкі. Насельніцтва заходніх краін, уцягнутых у «халодную вайну», стамілася ад высокіх падаткаў, ад вечнай трывогі за заўтрашні дзень.

Усяму свету вядома, што прычынай існуючага міжнароднага напружання з'яўляюцца агрэсіўныя імкненні правячых колаў ЗША і некаторых іншых дзяржаў. Аднак прадстаўнік ЗША пан Уодсварт, які тут выступаў, прабаваў абяліць і апраў-

якія паглынаюць штогод дзесяткі мільярдаў долараў. Далес выставіў у сваёй прамове тэзіс, быццам гэтыя расходы з'яўляюцца «платай за мір», быццам палітыка гонкі ўзбраенняў—гэта «палітыка страхавання міру». З аргументаў Далеса вынікае, што «палітыкай страхавання міру» ён называе будаўніцтва амерыканскіх ваенных баз ва ўсім свеце, накапленне ядзернай зброі, утрыманне і ўзбраенне чанкайшыстаў і лісынманаўцаў. «Палітыкай страхавання міру» Далес называе ўмяшанне ў справы краін Блізкага і Сярэдняга Усходу, таму што гэты раён «дае нафту, неабходную для прамысловасці Заходняй Еўропы і для ваеннай сістэмы НАТО».

«За апошнія дзесяць год,—гаворыць Далес,—Злучаныя Штаты заключылі дагаворы з 42 краінамі Амерыкі, Еўропы і Азіі. Гэтыя дагаворы знішчаюць для дагаворных краін прынцып нейтралітэту». «Устарэлая канцэпцыя», «амаральная блізарукая канцэпцыя» — так называе дзяржаўны сакратар ЗША Далес незалежную палітыку, што праводзяць урады многіх краін, якія не жадаюць надзяваць на сябе ярмо агрэсіўных блокаў.

Такім чынам, нястрымная гонка ўзбраенняў, ліквідацыя незалежнасці суверэнных дзяржаў—вось што называе Далес «палітыкай страхавання міру», вось

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы